**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
савета па абароне дысертацый Д 02.23.01 пры Акадэміі адукацыі
па дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.**

Дысертацыя адпавядае галіне навукі (педагагічныя навукі), спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.**

Упершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі комплексна вызначаны і абгрунтаваны канцэптуальныя асновы яе станаўлення ў Рэспубліцы Беларусь, тэндэнцыі развіцця як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы, што забяспечвае мадэрнізацыю структуры і зместу, аптымізацыю функцый адукацыі ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага краіны і беларускай мадэлі гістарычнай памяці.

**Навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень:**

– характарыстыку школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы, вывучэнне якой мае міждысцыплінарны характар, абумоўлены спалучэннем метадалогіі гісторыі адукацыі і гістарычнага пазнання пры ўдакладненні канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, змястоўна-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў у сукупнасці з фактарамі, якія іх дэтэрмінуюць (нарматыўна-прававая распрацоўка канцэптуальных асноў, афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі, трансляцыя зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ва ўмовах міжпакаленнай камунікацыі);

– сістэматызацыю метадалагічных падыходаў, якія выкарыстоўваюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі: акадэмічна-гістарычныя (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны), агульнапедагагічныя (культуралагічны і кампетэнтнасны ў іх пераемнасці), прадметна-гістарычныя (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) і забяспечваюць міждысцыплінарны характар гісторыка-педагагічнага даследавання;

– канструяванне структурна-змястоўнай (у складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, змястоўна-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў) мадэлі вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як універсальнага інструмента яе гісторыка-педагагічнага даследавання;

– вызначэнне комплексу рэпрэзентатыўных працэсаў канцэптуалізацыі (канцэпцыі 1991, 2009, 2022 гг.), стандартызацыі (адукацыйныя стандарты 1998, 2009, 2018 гг.), рэалізацыі агульнапедагагічных падыходаў, стварэння пяці пакаленняў школьнай вучэбнай літаратуры, афармлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, што стала асновай для распрацоўкі перыядызацыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі: канцэптуальна-вызначальны этап (1991–1997); метадычна-стваральны этап (1998–2008); канцэптуальна-прадметны этап (2009–2014); кампетэнтнасна-арыентаваны этап (2015–2022) з абазначэннем у 2023–2024 гг. пачатку сучаснага этапу, звязанага з рэалізацыяй Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і інтэграванага курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі»;

– выяўленне тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў іх сукупнасці, звязаных з эвалюцыяй канцэптуальнага мэтавызначэння ад захавання вузкапрадметна-ведавай прыярытэтнасці да арыентаванасці на развіццё такіх інтэграваных характарыстык асобы, як гістарычная памяць і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць; з актуалізацыяй прынцыпаў абнаўлення зместу (дыскрэтнасць, вобразнасць, антрапалагізацыя, культурна-гістарычнае асяроддзе, гістарычная дыялагічнасць); з цыклічнасцю ў рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу; з актуалізацыяй светапоглядна-выхаваўчай ролі (захаванне гістарычнай памяці і рэалізацыя яе кансалідацыйнай ролі, канструяванне тэрытарыяльна-культурных і нацыянальна-дзяржаўных змястоўных маркераў, выкарыстанне ў якасці маральных арыенціраў канкрэтна-гістарычных аналагаў паводзін чалавека ў гісторыі);

– вызначэнне ў якасці маркераў кантэнт-аналізу міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства праз іх навукова-тэарэтычнае вызначэнне прадстаўнікамі беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і ўвасабленне ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы з улікам яе інтэграванасці ў сістэму грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, духоўна-культурных рэалій Рэспублікі Беларусь;

– канкрэтызацыю перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з улікам рэалізацыі нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі; актуалізацыі патрыятычнага выхавання праз ажыццяўленне яго сацыяльна-педагагічнай мадэлі; удакладнення прынцыпаў адбору зместу адукацыі, абумоўленых яе мэтамі і місіяй, каштоўнаснымі арыентацыямі вучняў, траістай прыродай навукова-гістарычнага факта, удакладненнем змястоўных ліній, пераадоленнем празмернай фактaлагічнасці зместу, інтэграцыяй зместу гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі, фарміраваннем функцыянальнай адукаванасці вучняў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.** Вынікі даследавання з'яўляюцца запатрабаванымі ў навукова-метадычным забеспячэнні дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры па гісторыі, пры павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, у працэсе фарміравання ў вучняў гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту.

Старшыня савета па абароне дысертацый Г.М. Валочка

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый М.Б. Гарбунова

28.02.2025